


*С.А. БАЛАШЭНКА*

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПРАВАВОЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА



***Сяргей Аляксандравіч Балашэнка*** - доктар юрыдычных навук, дацэнт, дэкан юрыдычнага факультэта, загадчык кафедры экалагічнага і аграрнага права. Аўтар больш за 60 навуковых прац. Сярод іх манаграфіі і вучэбнікі: «Государственное управление в области охраны окружающей среды» (2000); «Обзор экологического законодательства Республики Беларусь» (2003). Даследуе праблемы аховы навакольнага асяроддзя і дзяржаўнага кіравання.

The article considers the historical roots, the formation and development of the school of law in Belarus and the Belarusian State University, the role and the place of science of law in modern society. It notes, that the Belarusian science of law reflects the whole complicated process of the development of society and the Belarusian state system.

Беларуская прававая школа мае глыбокія гістарычныя карані. Сапраўднай рэвалюцыяй у праватворчасці было выданне ў Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) Статутаў 1529, 1566, 1588 гг. - першых у Еўропе такога ўзроўню зводаў законаў, заснаваных на мясцовым звычаёвым праве, традыцыях народа і напісаных на старажытнай беларускай мове. Менавіта гэта мела важнае значэнне, бо на той час большасць еўрапейскіх дзяржаў карысталіся рымскім правам і лацінскай мовай. Сістэматызацыя заканадаўства патрабавала перапрацоўкі назапашанага ў дзяржаве нарматыўна-прававога матэрыялу, што якраз і павялічвала каштоўнасць нацыянальнага права, пашырала сферу дзейснай юрыспрудэнцыі.

Гэтыя прававыя помнікі высокага ўзроўню распрацаваныя і апублікаваныя нашымі землякамі на роднай мове. Асаблівае значэнне меў Статут ВКЛ 1588 г., перакладзены на лацінскую і польскую мовы, які практычна на працягу двух наступных вякоў з'яўляўся асноўнай прававой крыніцай на тэрыторыях многіх дзяржаў.

У XVI ст. шэраг знакамітых юрыстаў (Францыск Скарына, Міхалон Літвін, Сымон Будны, Андрэй Волан, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Леў Сапега і інш.) на падставе папярэдніх навуковых напрацовак даследавалі праблемы дзяржавы і права, выносілі прапановы па іх удасканаленню. Актывізацыя навуковай дзейнасці была выклікана практычнымі патрэбамі законатворчасці, што і знайшло адлюстраванне ў правядзенні некалькіх агульных кадыфікацый заканадаўства на працягу XVI ст.

Падрыхтоўка юрыдычных кадраў ішла рознымі шляхамі. Частку юрыстаў рыхтавалі заходнееўрапейскія універсітэты, дзе з сярэдзіны XV ст. павялічылася колькасць кафедраў рымскага права.

Першай спецыяльнай юрыдычнай навучальнай установай у ВКЛ стала Святаянская школа грамадзянскага права, створаная ў Вільні ў 1566 г. Веды ў галіне права можна было атрымаць і ў кальвінісцкіх і арыянскіх школах, якія існавалі на Беларусі ў перыяд Рэфармацыі. У прыватнасці, права выкладалі ў Слуцкім кальвінісцкім вучылішчы, у арыянскіх школах у Іўі, Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку і інш. Аднак гэтыя цэнтры падрыхтоўкі юрыстаў не маглі поўнасцю задаволіць патрэбу ў кадрах і таму іх значная колькасць рыхтавалася ў прыватных школах (палестрах), г. зн. праходзіла тэарэтыка-практычную падрыхтоўку ў вопытных юрыстаў-практыкаў.

Павышэнне інтарэсу да прававой адукацыі выклікала неабходнасць выдання спецыяльнай юрыдычнай літаратуры. Па звестках А. Анушкіна, у друкарнях ВКЛ у XVI ст. было надрукавана 16 юрыдычных кніг. Выдавался друкаваным спосабам і заканадаўчыя акты (напрыклад, Статут 1588 г., закон аб Галоўным судзе (Трыбунале) і інш.). Усяго ж у ВКЛ у XVI ст. было выдана каля 500 кніг на лацінскай, беларускай, польскай і іншых мовах, а ў XVII ст. колькасць іх павялічылася ў шмат разоў (па некаторых звестках - да 5 тыс.). Акрамя таго, кнігі беларускіх аўтараў выдаваліся і за межамі дзяржавы[1].

Пачынальнікам кнігадрукавання і адным з першых распрацоўшчыкаў беларускай прававой навукі з'яўляецца Францыск Скарына, дзяржаўна-прававыя ідэі якога грунтаваліся на глыбокім аналізе сусветнай гісторыі. Значны уклад у развіццё прававой навукі ўнеслі такія прадстаўнікі рэфармацыйнага руху на Беларусі, як Марцін Чаховіц, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя, якія ўжо непасрэдна займаліся праблемамі прававога рэгулявання грамадскіх адносін, праваразумення, крыніц права і г. д.

Веды ў галіне права давала найстарэйшая вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі - Віленскі універсітэт, заснаваны ў ВКЛ у 1570 г. езуітамі як калегіум. У 1578 г. кароль Стэфан Баторый выдаў прывілей (зацверджаны 30.10.1579 г. булай папы Грыгорыя XIII), на падставе якога калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію, што давала права прысвойваць вучоныя ступені, мець выбарную адміністрацыю, правы ўласнай юрысдыкцыі. Першым рэктарам акадэміі стаў ідэолаг контррэфармацыі, знакаміты мысліцель Пётр Скарга. Акадэмія мела філасофскі і тэалагічны факультэты.

Матэрыяльную падтрымку акадэміі аказвалі каталіцкая царква і мясцовыя феадалы. Сын Льва Сапегі - Казімір перадаў акадэміі каштоўную бібліятэку і садзейнічаў адкрыццю ў 1641 г. юрыдычнага факультэта. У акадэміі дзейнічалі дзве кафедры кананічнага і дзве грамадзянскага права. Паводле прыблізных падлікаў, з 1583 па 1781 г. акадэмія прысвоіла сваім выпускнікам 4076 навуковых ступеняў, у тым ліку 149 - па праву.

Сярод найбольш вядомых выпускнікоў акадэміі былі Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, Мацей Сарбеўскі, Альберт Каяловіч, Аарон Алізароўскі. У сувязі са спыненнем дзейнасці ордэна езуітаў акадэмія перайшла пад апеку Адукацыйнай камісіі, якая пераўтварыла яе ў вышэйшую навучальную ўстанову новага тыпу (з 1781 г. акадэмія называлася Галоўнай школай Вялікага княства Літоўскага).

Пасля далучэння Беларусі да Расіі названая школа ў 1803 г. была рэарганізавана ва універсітэт, з якога выйшлі такія вядомыя вучоныя, грамадскія дзеячы і пісьменнікі, як А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, Ю. Крашэўскі, І. Даніловіч, І. Дамейка, Т. Зан, Я. Чачот і інш.

У Полацку на базе Полацкага езуіцкага калегіума (сярэдняя навучальная ўстанова; існавала з 1580 г.) 29.05 (10.06) 1812 г. была адкрыта Полацкая езуіцкая акадэмія - вышэйшая навучальная ўстанова, надзеленая правамі універсітэта. Выкладанне вялося па падручніках еўрапейскіх універсітэтаў,

а таксама па ўласных падручніках, якія выдаваліся ў акадэмічнай Полацкай друкарні. У 1820 г. акадэмія была закрыта, частка студэнтаў пераведзена ў Пецярбургскі універсітэт.

Пасля закрыцця Полацкай акадэміі, а затым і Віленскага універсітэта навуковыя даследаванні права на Беларусі былі прыпынены. Юрыдычныя праблемы з гэтага часу даследаваліся ва універсітэтах Пецярбурга, Масквы, Кіева, Варшавы.

Узнаўленне развіцця беларускай юрыдычнай навукі непасрэдна звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які складаўся з трох факультэтаў: рабочага, медыцынскага і грамадскіх навук. У апошнім функцыяніравала чатыры аддзяленні - грамадска-педагагічнае, літаратурна-лінгвістычнае, эканамічнае і прававое. У сувязі з утварэннем універсітэта Наркамат адукацыі РСФСР накіраваў у БССР трупу вучоных. Значны уклад у развіццё прававой навукі ў тэты перыяд унёс першы рэктар БДУ У.І. Пічэта, які кіраваў даследаваннямі і распрацоўваў шматлікія праблемы гісторыі Беларусі. Першымі выкладчыкамі на прававым аддзяленні былі Г.С. Гурвіч (савецкае дзяржаўнае права), У.М. Дурдзянеўскі (дзяржаўнае права буржуазных краін), М.Б. Кроль (судовая псіхіятрыя), І.Т. Цітоў (судовая медыцына), М.О. Грэдзінгер (грамадзянскае права і працэс), Б.В. Чрэдзін (рымскае права) і інш.

Дэканам факультэта грамадскіх навук быў прызначаны прафесар У.М. Ігнатоўскі, а з 1922 г. ім стаў прафесар С.Я. Кацэнбоген. Гэта былі яркія, неардынарныя асобы. Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі (1881—1931) — выдатны вучоны-гісторык, аўтар шэрага фундаментальных работ, буйны грамадскі дзеяч, ураджэнец Гродзенскай губерні, з сям'і сельскага інтэлігента-настаўніка, удзельнік рэвалюцыйнага руху, за што неаднойчы падвяргаўся арыштам. З 1914 па 1920 г. выкладае ў настаўніцкім інстытуце, у 1920-1921 гг. працуе ў Наркоме земляробства БССР, у Народным камісарыяце асветы, затым - дэканам факультэта грамадскіх навук БДУ, намеснікам рэктара універсітэта. З 1928 г. - сапраўдны член Акадэміі навук, а са студзеня[4] 1929 г. - прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР, які заставаўся на гэтай пасадзе да студзеня 1931 г.

Мяняліся вучэбныя планы, удакладняліся, прыстасоўваліся да новых умоў жыцця вучэбныя праграмы. Так, у 1924 г. была вылучана прапанова аб абмежаванні лекцыйнай сістэмы выкладання як не зусім эфектыўнай. Неўзабаве Народны камісарыят асветы дае указание аб адмене лекцыйнага метаду выкладання і замене яго семінарскімі, практычнымі заняткамі па прынцыпу лабараторна-брыгаднага метаду. Гэтае новаўвядзенне мела на мэце падрыхтоўку спецыялістаў у найбольш сціслыя, скарочаныя тэрміны: замест чатырох-пяці гадоў - за тры гады.

Першы выпуск адбыўся ў 1925 г. За пяць гадоў у БДУ было падрыхтавана ўжо 130 юрыстаў. На факультэце ў гэты час працавалі 12 прафесараў: У.І. Пічэта, С.Я. Вольфсан, А.В. Гарбуноў, М.О. Грэдзінгер, У.М. Дурдзянеўскі, Я.В. Доўнар-Запольскі, С.Я. Кацэнбоген, Н.Н. Краўчанка, М.А. Прыляжаеў, У.М. Перцаў, В.Н. Шыраеў, Б.В. Чрэдзін, а таксама дацэнты і асістэнты (А.М. Арцымовіч, Ф.І. Гаўзе, М.А. Канаплін і інш.). І ў гэтым жа годзе (26 жніўня) прымаецца Пастанова Саўнаркома БССР аб стварэнні факультэта права і гаспадаркі. 10 кастрычніка 1925 г. праходзіць першае пасяджэнне дэканата новага факультэта. Дэканам прызначаецца прафесар С.Я. Вольфсан.

Пачынаецца актыўная вучэбная і навуковая работа. Адзін з першых даследчыкаў гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі Р.Я. Парэчын выдаў кнігу «Наша Канстытуцыя» (1928), у якой прааналізаваў Асноўны Закон БССР 1927 г. Праца М.М. Гуткоўскага «Сістэматычны паказчык (спроба сістэматыкі) заканадаўства Беларускай ССР за 1919-1928 гг.» (1929) з'яўлялася прыкладам цеснай сувязі навукі і практыкі.

У гэты час юрыстаў Беларусі цікавілі таксама пытанні аб прававых формах узаемаадносін савецкіх рэспублік, прыродзе іх дзяржаўнага саюза, развіцці заканадаўства. Акрамя таго, Інбелкульт пачаў выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI—XVII ст., якія ўваходзілі ў склад Літоўскай метрыкі. Былі выдадзены тры тамы кнігі «Беларускі архіў» (1927-1930). Адметнай з'явай у сферы юрыдычных даследаванняў Інбелкульта сталі «Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права» - збор артыкулаў па розных галінах юрыдычнай навукі: дзяржаўнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, грамадзянскага, зямельнага права, судаводства, гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, якія выйшлі ў 1929 г. (М.О. Грэдзінгер, Р.Я. Парэчын, М.А. Канаплін, В.М. Шыраеў, Ф.І. Гаўзе, М.М. Гуткоўкі, Е.А. Вішнеўскі, Н.А. Бонч-Асмалоўскі). Друкаваліся асобныя кнігі, прысвечаныя грамадзянскаму і грамадзянска-працэсуальнаму праву, крымінальнаму і крымінальна-працэсуальнаму праву, шлюбна-сямейнаму праву і інш. Так, М.О. Грэдзінгер апублікаваў падручнік па грамадзянскім працэсе БССР, В.М. Шыраеў прысвяціў свае працы дзейнасці следчых органаў, органаў суда і пракуратуры, У.М. Дурдзянеўскі, М.А. Канаплін, Л.А. Рудзіцкі, П.М. Галанза - савецкаму дзяржаўнаму праву.

Значнае месца ў даследаваннях правазнаўцаў БДУ займала гісторыя беларускага народа, і пачатак гэтаму быў пакладзены працамі першага рэктара БДУ У.І. Пічэты, які выдаў больш за 130 навуковых прац, прысвечаных гісторыі права, эканомікі, культуры і палітычнай гісторыі Беларусі. У канцы 1920-х гг. у Беларусі пачалася ідэалагічная кампанія барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, у час якой былі рэпрэсіраваны У.І. Пічэта, Р.Я. Парэчын, М.М. Гуткоўскі, В.Д. Дружчыц і іншыя, што ў сваю чаргу выклікала скарачэнне навуковых даследаванняў.

У 1930 г. факультэт права і гаспадаркі перайменоўваецца ў факультэт савецкага будаўніцтва і права. У 1931 г. са складу БДУ вылучаецца Мінскі інстытут савецкага будаўніцтва і права, які ў 1932 г. быў пераўтвораны ў Мінскі юрыдычны інстытут.

12 кастрычніка 1940 г. Саўнаркам Саюза ССР прыняў Пастанову «Об установлении платности обучения в старших классах средних школ и в высших учебных заведениях СССР и об изменении порядка назначения стипендий». Адносіны да гэтага дакумента ў грамадстве і сярод студэнцтва былі неадназначнымі. Некаторыя ўспрымалі гэтыя меры як неабходныя і непазбежныя ў сітуацыі, якая склалася, іншыя - адмоўна і нават з абурэннем, аж да пакліча «выйсці на вуліцы з дэманстрацыяй пратэсту» (Мінскі медыцынскі інстытут), лічачы іх «контрреволюционными», супярэчнымі Асноўным Законам - Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі 1937 г., якія гарантавалі ўсім грамадзянам краіны бясплатную адукацыю.

Аб адмоўнай рэакцыі на дадзеную пастанову Саўнаркома сведчыць і інфармацыйна-аналітычная запіска аддзела школ і ВНУ ЦК КП(б)Б, у якой адзначалася, што ўвядзенне платнасці адукацыі ў ВНУ выклікала сярод студэнтаў шмат пытанняў, у тым ліку: ці няма супярэчнасці паміж гэтай пастановай СНК СССР і арт. 121 Канстытуцыі СССР; ці будзе ў сувязі з гэтым дазволена вольнае наведванне заняткаў; ці змогуць у дадзеных умовах атрымаць вышэйшую і сярэднюю адукацыю выхаванцы дзіцячых дамоў і дзеці з малазабяспечаных сем'яў; ці будзе ў сувязі з гэтым дазволена студэнтам працаваць для прадаўжэння навучання і г. д.

Уведзеныя гэтай пастановай навіны прывялі да скарачэння ў шэрагу ВНУ колькасці студэнтаў, многія з якіх папрасілі перавесці іх на завочную форму навучання. Аднак у цэлым, як адзначалася ў вышэйназванай запісцы, «настроение студентов в связи с выходом упомянутого постановления в основном здоровое». У пацвярджэнне сказанаму прыводзіцца прыклад: студэнты Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута Мотальскі, Забалоцкі,

Хрэбролаў, Кушнер, Есялеўскі і інш. заявілі: «Ну, и что ж, Постановление СНК СССР ориентирует нас на то, чтобы учиться на "отлично". Будем добиваться отличных успехов!»

Многія бацькі студэнтаў таксама аднесліся да гэтай пастановы станоўча. Яны адпраўлялі сваім дзецям тэлеграмы наступнага зместу: «Оставайтесь, учитесь, поможем». У выніку ў юрыдычным інстытуце з-за ўвядзення платнасці адукацыі пакінулі заняткі толькі 8 студэнтаў. Такім чынам, і ў такіх складаных умовах узялі верх усё-такі імкненне да ведаў і патрыятычныя пачуцці.

Напярэдадні вайны ў інстытуце ўжо былі спецыялізаваныя кабінеты і лабараторыі. Спрыялі паляпшэнню выкладання і засваення ведаў па крыміналістыцы спецыялізаваныя кабінеты крыміналістыкі, гісторыі і тэорыі дзяржавы і права і савецкага дзяржаўнага права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права і крымінальнага працэсу, крыміналістычная лабараторыя.

З першых дзён акупацыі ў горадзе, як і ў іншых месцах, захопленых варожымі войскамі, сталі ствараццa падпольныя трупы і іншыя патрыятычныя антыфашысцкія аб'яднанні і фарміраванні. Да канца 1941 г. толькі ў Мінску дзейнічалі каля 50 такіх груп і арганізацый.

Адна з першых патрыятычных груп была арганізавана М.Б. Осіпавай, выпускніцай юрыдычнага інстытута, былым сакратарам партыйнай арганізацыі МЮІ ў 1939-1940 гг. Падпольная група, якая дзейнічала ў Мінску пад яе кіраўніцтвам, пастаянна пашыралася; з ліпеня 1941 г. па верасень 1943 г. яе колькасць павялічылася да 50 чалавек. Адна з самых гераічных старонак у жыцці гэтай выдатнай патрыёткі-падпольшчыцы - яе ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні аперацыі па знішчэнню галоўнага ката беларускага народа, асабістага прадстаўніка Гітлера ў Беларусі, гаўляйтэра Вільгельма фон Кубэ, якая была праведзена ў ноч з 21 на 22 верасня 1943 г.

Сапраўдным героем і патрыётам сваёй Айчыны праявіў сябе ў гэтыя цяжкія гады і былы студэнт юрыдычнага інстытута В.С. Жудро. Навекі ў памяці народнай і ў гісторыі юрыдычнага факультэта засталося імя выкладчыцы крымінальнага працэсу А.А. Сакаловай (1902-1942). Гэтыя маладыя людзі, якія прайшлі праз гарніла вайны, складалі касцяк студэнцтва першых пасляваенных гадоў і асноўнае ядро грамадскіх арганізацый. Напрыклад, у 1949 г. такіх студэнтаў у БДУ было 118 чалавек, у політэхнічным інстытуце - 197, у юрыдычным - 137, у медыцынскім - 143.

Прававая навука Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны нанесла цяжкія страты. У сувязі з гэтым у першыя пасляваенныя гады з-за адсутнасці навуковых кадраў даследаванні па прававых праблемах амаль не праводзіліся. 20 верасня 1944 г. Саўнаркам БССР прымае Пастанову «О возобновлении деятельности Белорусского юридического института». У сваёй службовай запісцы на імя намесніка Старшыні Саўнаркома СССР В.М. Молатава Народны камісар юстыцыі БССР І.А. Падута пісаў: «В Минске возобновил свою работу Минский юридический институт Наркомата юстиции БССР. МЮИ получил разрушенное здание, требующее немедленного ремонта и оборудования. Государственная плановая комиссия при СНК БССР отказала в отпуске стройматериалов для ремонта учебного корпуса и общежития студентов института.

Прибывающих студентов и преподавательский состав разместить негде, так как принадлежащие институту здания по ул. Заславской, 33, 35 и ул. Революционной, 23а заняты гражданами и военной комендатурой. Это влечет за собой отсев студентов, а преподаватели уезжают обратно. Все это создает угрожающее положение в работе института...»

Як і іншыя ВНУ, юрыдычны інстытут адчуваў востры недахоп у выкладчыцкіх кадрах. У сувязі з аднаўленнем дзейнасці Мінскага юрыдычнага

інстытута на пастаянную навукова-педагагічную работу сюды былі накіраваны дацэнт І.С. Андрэйчык, прызначаны дырэктарам інстытута; дацэнты Ф.І. Гаўзе, М.Ц. Баран, В.С. Шчаглоў, В.П. Юдзін.

Ужо на 1 кастрычніка 1945 г. у юрыдычным інстытуце з 15 выкладчыкаў, якія забяспечвалі вучэбны працэс, 11 працавалі на пагадзіннай аплаце працы ў якасці сумяшчальнікаў, на 1 кастрычніка 1946 г. - 20 выкладчыкаў працавалі па сумяшчальніцтву, а ў 1948/49 навучальным годзе на 39 штатных адзінак у МЮІ прыходзілася 10 сумяшчальнікаў.

У 1954 г. Мінскі юрыдычны інстытут быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт БДУ. Дэканам юрыдычнага факультэта стаў Яўгеній Міхайлавіч Семярыхін (1914-1963), кандыдат юрыдычных навук (1949), дацэнт (1954), які працаваў у Мінскім юрыдычным інстытуце і на юрыдычным факультэце БДУ з 1947 па 1963 г. З 1947 па 1950 г. Я.М. Семярыхін быў дырэктарам Мінскага філіяла УЮЗІ, а з 1958 па 1959 г. зноў працаваў дэканам юрыдычнага факультэта.

У другой палове 1950-х і ў 1960-я гг. у СССР пачаўся працэс пашырэння правоў саюзных рэспублік, у тым ліку і ў галіне законатворчасці, што садзейнічала актывізацыі навуковых юрыдычных даследаванняў. Распрацоўка і прыняцце новых законаў (у тым ліку і кодэксаў) патрабавалі актыўнага ўдзелу прадстаўнікоў юрыдычнай навукі ў законатворчым працэсе. У гэты перыяд у рэспубліцы быў пакладзены пачатак новаму накірунку гісторыка-прававой навукі - гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР (кніга С.П. Маргунскага «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921-1925)», 1966). У 1958 г. выдадзена калектыўная праца «Очерки по истории государства и права БССР». У 1970-1976 гг. надрукаваны два тамы «Истории государства и права Белорусской ССР» (аўтары С.П. Маргунскі, І.І. Пацяружа, В.М. Арцёмава, Ю.П. Броўка, М.В. Сторажаў, В.І. Семянкоў, В.І. Шабайлаў, І.А. Юхо і інш.). Выкананне гэтай вельмі значнай і вялікай працы стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву навукоўцаў АН БССР, БДУ, Мінскай вышэйшай школы МУС СССР.

У БДУ актывізуюцца даследаванні па ўсіх накірунках права, у тым ліку па тэорыі дзяржавы і права (В.А. Дарогін, С.Р. Драбязка), канстытуцыйным і адміністрацыйным праве (А.А. Галаўко, Л.А. Прыходзька, А.Ц. Лейзераў, А.М. Крамнік), гісторыі дзяржавы і права Расіі (Б.Я. Бабіцкі, А.С Фарфель, Э.А. Калініна, У.П. Сярэбранікаў). Быў выдадзены шэраг прац: І.А. Юхо («Правовое положение населения Белоруссии в XVI в.» (1978)); А.А. Галаўко («Деятельность Советов Белоруссии по осуществлению экономической политики в деревне в 1927-1936 годах» (1968)); І.І. Марціновіч («История суда в БССР», 1961, «Адвокатура в БССР» (1973)) і іншых навукоўцаў.

Складаным і супярэчлівым пытанням савецкага будаўніцтва і права прысвяцілі свае навуковыя працы В.А. Дарогін («Суверенитет в советском государственном праве» (1948)), СР. Віхараў («Суверенитет Белорусской ССР в составе Союза ССР» (1958)), С.Р. Драбязка («Право и материально-техническая база коммунизма» (1967)), А.Ц. Лейзераў («Конституционный принцип гласности работы Советов народных депутатов» (1981)), А.М. Абрамовіч («Государственное управление строительством в СССР» (1982)), А.Г. Цікавенка («Начальник и подчиненный. Правовые аспекты служебных отношений» (1984)), А.А. Галаўко («БССР - суверенное социалистическое государство» (1989)), А.М. Крамнік («Адміністрацыйныя паўнамоцтвы сельскага Савета дэпутатаў працоўных» (1974)), Я.М. Тагуноў («Народный контроль над деятельностью аппарата управления местных Советов» (1975)), П.К. Еўдакімаў («Ответственность лиц, ведущих паразитический образ жизни» (1963)) і інш.

Аб'ектам увагі навукоўцаў-цывілістаў сталі праблемы абавязацельнага жыллёвага права, грамадзянска-прававога забеспячэння правоў і інтарэсаў

грамадзян і іншыя пытанні. Былі выдадзены працы В.Ф. Чыгіра («Договор подряда по капитальному строительству» (1958); «Советское жилищное право» (1968)), Ф.І. Гаўзе («Обязательственное право» (1968); «Социалистический гражданско-правовой договор» (1972)), а таксама працы А.М. Рамановіч, В.В. Левага, Я.А. Ціханенка і інш. Пазней праблемы навукі грамадзянскага права пачалі распрацоўваць У.А. Раманенка, В.М. Гадуноў, а таксама І.М. Шчамялёва, СП. Сакалоў і інш.

У сферы шлюбна-сямейных праваадносін шырока вядомы даследаванні прафесара М.Р. Юркевіча («Семья в современном обществе» (1964); «Заключение брака по советскому праву» (1965)) і інш. Дзейнасці судовых органаў і дзяржаўнага арбітражу, а таксама тэарэтычным праблемам грамадзянскага працэсуальнага права прысвечаны манаграфіі С.В. Курылёва («Объяснение сторон как доказательство в советском гражданском процессе» (1956); «Основы теории доказательства в советском правосудии» (1969)). У публікацыях О.С. Курылёвай, А.А. Войціка, ХТ. Мялешкі, Н.І. Красоўскай, В.П. Дуюна, Т.М. Пятачэнка, Т.І. Каробкінай, Г.Б. Шышко разглядаліся шматлікія пытанні працоўнага права. Даследавалі і працягваюць даследаваць самыя актуальныя праблемы грамадзянска-працэсуальнага права Т.А. Бялова, І.М. Калядка, І.М. Казей, В.В. Ціхановіч, В.Г. Ціхіня, М.Р. Юркевіч і інш. Склалася беларуская школа грамадзянскага і працоўнага права.

Навукоўцы факультэта прымалі ўдзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў, у тым ліку Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. У 1989 г. быў выдадзены «Юрыдычны слоўнік». Юрысты-гісторыкі (Я.А. Юхо, Т.І. Доўнар, Л.В. Паўлава і інш.) удзельнічалі ў перавыданні знакамітага помніка права-Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. (1989), падрыхтоўцы іншых энцыклапедычных выданняў: «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 тамах (1994-2003), «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» (1995) і г. д.

Цесна звязаны з жыццём даследаванні па крымінальна-прававой тэматыцы. Навукоўцы, якія займаюцца пытаннямі крымінальнага права, аказвалі дапамогу праваахоўчым органам у юрыдычнай кваліфікацыі супрацьпраўных дзеянняў. Пра гэта сведчаць назвы выдадзеных прац: І.І. Гарэлік- «Квалификация преступлений, опасных для жизни и здоровья» (1973) і «Ответственность за оставление в опасности» (1960); І.С. Цішкевіч - «Условия и пределы необходимой обороны» (1989) і «Приготовление и покушение по советскому уголовному праву» (1958); П.А. Дубавец-«Ответственность за телесные повреждения по советскому уголовному праву» (1964); Е.Н. Кічыгіна - «Ответственность за нарушение безопасности движения городского транспорта» (1966). Пазней праблемы крымінальнай навукі знайшлі свае адлюстраванне ў публікацыях В.А. Шкурко, М.М. Меркушава, У.А. Баркова, У.М. Хоміча, І.О. Грунтова, М.А. Бабія і інш.

Значную дапамогу юрыстам-практыкам аказвалі працы працэсуалістаў: Я.А. Мацвіенкі - «Судебная речь» (1967), «Приговор суда и его исполнение» (1968); С.П. Бякешкі, Я.А. Мацвіенкі - «Подозреваемый в советском уголовном процессе» (1969); В.М. Шпілёва - «Содержание и формы уголовного судопроизводства» (1974) і інш. Праблемы крымінальнага працэсу, арганізацыі і дзейнасці пракуратуры распрацоўваліся СП. Бякешкам, В.М. Бібіла, А.А. Данілевічам.

Вучоныя факультэта актыўна праводзілі даследаванні праблем крыміналістыкі. Былі апублікаваны працы А.В. Дулава («Вопросы теории судебной экспертизы» (1953); «Введение в судебную психологию» (1970); «Основы психологического анализа на предварительном следствии» (1973); «Судебная психология» (1970)), М.М. Гапановіча («Опознание в судопроизводстве» (1975)), І.А. Матусевіч («Изучение личности обвиняемого в процессе предварительного расследования преступлений» (1975)), Р.А. Шумака («Бухгалтерский анализ как метод расследования преступлений» (1985)) і інш.

Ва ўзаемадзеянні з вучонымі АН Беларусі ажыццяўляліся даследаванні пытанняў землекарыстання, аховы прыроды, арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і інш. Выйшлі манаграфіі М.В. Сторажава «Правовое положение колхозов на современном этапе» (1975), «Правовой режим мелиорированных земель» (1986), «Материальная ответственность колхозников» (1971).

Міжнародная дзейнасць Беларускай ССР асвятлялася ў працах Ю.П. Броўкі «Международная правосубъектность БССР» (1967) і «Белорусская ССР - суверенный участник международного общения» (1974); Л.В. Паўлавай (у сааўт.) - «Имплементация международного гуманитарного права» (1998).

Новы этап развіцця універсітэцкай юрыдычнай навукі быў звязаны з карэннай рэарганізацыяй усяго грамадска-палітычнага ладу і абвяшчэннем Дэкларацыі аб суверэнітэце БССР 1990 г. У Рэспубліцы Беларусь пачаўся працэс дэмакратызацыі грамадства і фарміравання якасна новай прававой сістэмы, у якім прынялі актыўны ўдзел вучоныя юрыдычнага факультэта. Заўсёды ў сувязі з пераменамі даследчыкі шукаюць філасофскія і ідэалагічныя арыенціры, якія б дапамагалі навуковаму асэнсаванню рэчаіснасці. З мэтай вырашэння канкрэтных задач дзяржаўна-прававога будаўніцтва перш за ўсё неабходна глыбокае разумение асноватворных паняццяў: «дзяржава і права»; «дзяржава і асоба»; «сацыяльная прававая дзяржава» і інш. Публікацыі навукоўцаў юрыдычнага факультэта апошніх гадоў (манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы і інш.) адлюстроўваюць новыя тэндэнцыі ў прававой навуцы. У публікацыях вучоных-тэарэтыкаў (А.М. Абрамовіча, С.Р. Драбязкі, А.Г. Цікавенкі і інш.) надаецца ўвага тэарэтычным падставам удасканалення дзяржаўнага апарату і права, шляхоў пабудовы дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь. Гісторыкі права (Т.І.Доўнар, У.М. Сатолін, І.А. Юхо) працягваюць даследаваць дзяржаўнасць і права Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду, прысвячаюць свае працы выяўленню гістарычных асаблівасцей і пераемнасці дзяржаўна-прававога будаўніцтва, прымаюць актыўны ўдзел у перавыданні старажытных нарматыўных актаў. Пакладзены пачатак стварэнню шматтомнай працы па гісторыі дзяржаўнасці і права Беларусі са старажытнасці да нашых дзён, выдадзена кніга Р.А. Васілевіча, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо «Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі» (2001).

На кафедры канстытуцыйнага права праводзяцца даследаванні новага канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага заканадаўства, сістэмы дзяржаўнай улады, узаемаадносін дзяржавы і чалавека, сістэмы мясцовага самакіравання, прававога статуса грамадзяніна і чалавека. Выдадзены шэраг кніг Р.А. Васілевіча «Парламент Республики Беларусь. Конституционно-правовой аспект» (1995); «Конституция и некоторые вопросы защиты прав и свобод гражданина» (1998); «Органы государственной власти Республики Беларусь» (1998); «Нормативно-правовые акты Республики Беларусь» (2000); «Конституция Республики Беларусь. Научно-практический комментарий» (2005) і інш.

Актуальным праблемам права прысвечаны кнігі І.І. Марціновіч «Судебно-правовая реформа в Республике Беларусь» (у сааўт. з М.І. Пастуховым, 1995) і інш.; В.Ф. Чыгіра - «Приватизация жилья» (1993), «Юридические лица» (1994), «Кредиты и субсидии на приобретение и оплату жилья» (1996); І.С. Цішкевіча - «Квалификация хищений имущества» (1996) і інш.

Важным накірункам юрыдычнай навукі Беларусі сталі даследаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, у тым ліку кіравання прыродакарыстаннем і аховай навакольнага асяроддзя (С.А. Балашэнка); правоў грамадзян у сферы навакольнага асяроддзя (Т.І. Макарава); аховы навакольнага

асяроддзя гарадоў (Н.А. Шынгель); прыродных тэрыторый, якія ахоўваюцца (В.Я. Лізгара); прававога рэжыму лясоў (А.У. Лаеўская). Выдадзены кнігі С.А. Балашэнкі, Т.І. Макаравай «Международно-правовая охрана окружающей среды и права человека» (1999); С.А. Балашэнкі «Государственное управление в области охраны окружающей среды» (2000); С.А. Балашэнкі, А.У. Лаеўскай, Т.І. Макаравай «Право на благоприятную окружающую среду (как его защитить?)» (2000) і інш.

Аб актывізацыі навуковых даследаванняў на юрыдычным факультэце сведчаць шматлікія калектыўныя працы навукоўцаў: «Концепция Конституции БССР и формирование правовых основ гражданского общества и государства» (1991); «Теоретические проблемы формирования и функционирования гражданского общества и государства» (1995), «Право и демократия» (15 выпускаў, 1988-2004) і інш.

Адной з найважнейшых функцый юрыдычнай навукі з'яўляецца распрацоўка падручнікаў і дапаможнікаў. Так, былі выдадзены вучэбныя дапаможнікі: «Уголовное право» ў 2 т. (1978), «Крымінальнае права Беларусі» (1997), «Гражданский процесс» у 4 т. (1979-1982), «Гражданское право БССР» у 3 т. (1975-1978), «Уголовный процесс» у 3 ч. (1979), «Советское строительство» (1979), «Суд и правосудие в БССР» (1977), «Административное право Республики Беларусь» (1997), а таксама каля дзесяці вучэбных дапаможнікаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. У апошнія гады выдадзены падручнікі «Международное частное право» (1995), «Трудовое право» (1997), «Гражданское право» ў 2 ч. (2000, 2002), «Гражданский процесс. Общая часть» (2000), «Гражданский процесс. Особенная часть» (2002), надрукаваны навукова-практычныя каментарыі да грамадзянскага, крымінальнага, грамадзянска-працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў[2].

У 2004 г. на юрыдычным факультэце створана кафедра фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, якую ўзначаліў доктар юрыдычных навук, прафесар В.С. Камянкоў.

Даследаванні калектыву створанай кафедры адлюстраваны ў шэрагу навуковых прац у галіне фінансавага права, дзейнасці падатковых органаў і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку навуковых і навукова-метадычных дапаможніках, манаграфіях, вытворча-практычных выданнях. Так, у 2005 г. выдадзены кнігі В.С. Камянкова «Хозяйственный процесс», «Постатейный научно-практический комментарий к Закону об экономической несостоятельности (банкротстве)» (у сааўтарстве), «Процессуальные кодексы стран Содружества Независимых Государств о рассмотрении экономических споров» (у сааўтарстве), навучальны дапаможнік Т.С. Бойка, С.К. Лешчанка «Финансовое право», навукова-метадычны комплекс А.А. Піліпенкі «Налоговое право» і інш. Істотным дасягненнем вучоных факультэта стала выданне спецыяльных кніг (юрыдычных энцыклапедый, слоўнікаў, даведнікаў і інш.), адрасаваных практычным работнікам і шырокаму колу чытачоў.

Такім чынам, універсітэцкая юрыдычная навука на Беларусі прайшла вялікі і складаны шлях развіцця, на працягу якога роля і значэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта як вядучага цэнтра вышэйшай юрыдычнай адукацыі і навуковых даследаванняў у галіне права пастаянна ўзрастала. Беларуская юрыдычная навука адлюстравала ўвесь складаны паэтапны працэс развіцця грамадства і дзяржавы, што асабліва праявілася ў савецкі перыяд.

З набыццём рэспублікай рэальнага суверэнітэту пачаўся якасна новы этап развіцця беларускай юрыдычнай навукі, які праявіўся ва ўсіх яе галінах і накірунках. Дзеючая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвясціла сваёй

мэтай пабудову сацыяльнай дэмакратычнай прававой дзяржавы, што запатрабавала комплекснага падыходу да вывучэння прававых, эканамічных, сацыяльных, палітычных аспектаў рэфармавання дзяржавы і грамадства. Аб'яднаныя намаганні беларускіх вучоных-юрыстаў былі накіраваны на выпрацоўку тэарэтычных падстаў, шляхоў і сродкаў ажыццяўлення прававой рэформы, у тым ліку на пошук найбольш эфектыўных спосабаў рэфармавання грамадскіх адносін у мэтах забеспячэння паступальнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Прававая навука на юрыдычным факультэце ў апошняе дзесяцігоддзе істотна змянілася, асабліва ў сувязі з перадоленнем прававых уяўленняў, несумяшчальных з каштоўнасцямі прававой дзяржавы. Неабходнасць навуковых пошукаў у сферы права існавала заўсёды ў сувязі з тым, што яно бесперапынна змяняецца. Асабліва гэта датычыцца сучаснага этапа развіцця, калі навука прызвана фарміраваць адносіны да права як сродку ўдасканалення і гарманізацыі грамадскіх адносін, у тым ліку і сродку абароны неад'емных правоў і свабод чалавека.

Перад вучонымі юрыдычнага факультэта паўсталі новыя задачы - выпрацаваць накірункі і перспектывы развіцця прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь, шляхі і сродкі ўдасканалення палітычнай сістэмы, сфармуляваць тэарэтычныя асновы паспяховай і эфектыўнай праватворчасці, унесці прапановы па ўдасканаленню заканадаўства і г. д. У сувязі з гэтым на факультэце перш за ўсё вызначана кола найбольш важных і актуальных прававых праблем. З улікам айчыннага гістарычнага вопыту і прагрэсіўных напрацовак сусветнай юрыспрудэнцыі даследуюцца фундаментальныя тэарэтычныя праблемы дзяржавы і права, выпрацоўваюцца практычныя рэкамендацыі па ўдасканаленню дзеючага заканадаўства.

Важным накірункам навукова-даследчай работы факультэта з'яўляецца актыўны ўдзел у апошнія гады ў падрыхтоўцы і навуковым каменціраванні шэрага кодэксаў і законаў Рэспублікі Беларусь.

На штогодніх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, якія сталі традыцыйнымі на юрыдычным факультэце, абмяркоўваюцца важнейшыя праблемы юрыдычнай навукі, адбываецца абмен вопытам з вучонымі іншых краін. Неабходнай умовай перспектыўнага развіцця факультэта з'яўляецца падрыхтоўка маладой змены, якая будзе вызначаць будучае юрыдычнай навукі. Поспех у працэсе пераемнасці перш за ўсё залежыць ад узроўню кваліфікацыі выпускнікоў. Выкладчыкі факультэта надаюць гэтаму першачарговую ўвагу. На ўсіх кафедрах функцыяніруюць навуковыя гурткі. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у студэнцкай навукова-даследчай дзейнасці, аб чым сведчаць штогоднія канферэнцыі на факультэце і студэнцкія публікацыі. Акрамя таго, за апошнія пяць гадоў на факультэце абаронена звыш 40 кандыдацкіх дысертацый.

У сучасны перыяд вучоныя факультэта паспяхова распрацоўваюць усе накірункі прававой навукі, прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і навуковай экспертызе праектаў новых нарматыўных актаў. Скаардынаванымі намаганнямі вучоных-правазнаўцаў распрацоўваюцца праблемы суверэнітэту Беларусі і гарантый яго забеспячэння ў прававой, эканамічнай, сацыяльнай сферах.

[1] Гл.: Максимова Л.П. Юридический факультет Белорусского государственного университета. История и современность. Мн., 1998.

[2] Гл.: Юрыдычны факультэт: Гісторыя. Сучаснасць. Імёны / Рэд. савет: С.А. Балашэнка - старшыня, члены: Т.І. Доўнар, І.А. Юхо, Л.П. Максімава / Адк. рэдактар С.А. Балашэнка. Мн., 2004.

Паступіў у рэдакцыю 28.06.06.